*Золата* шырэй увайшло ўва ўжытак беларусаў па вайне. Яно стала даступным у выглядзе пярсьцёнкаў ды завушнічак, якія раней насілі хіба што паны альбо цыганы. *Золата* стала таньнейшым, бо яго здабывалі на Калыме, усяго толькі коштам вязьняў, між якіх былі й беларусы. Многія праз тое *золата* не вярнуліся дахаты.

Матчына *залатая* жуковінка. Даўно ня ношаная, амаль новая. Самая дарагая рэч у хаце. Рэліквія.

Пазьней, на мяжы 80-х гадоў, у моду ўвайшлі *залатыя* зубныя пратэзы. Беларусы ўстаўлялі сабе фіксы з дарагога мэталу, ня ведаючы, куды ж, апроч уласнага роту, укласьці заробленыя грошы.

Сёньня *золата* здабываюць не гаротныя беларусы-нявольнікі, а велізарныя беларускія „Белазы", якія вернуць вечную мерзлату недзе ў далёкай Якуціі.

*Золата* — гэта надзея. Як пісала Ларыса Геніюш:

> Квадраты дзён,
> запоўненыя працай,
> між імі — сонца *залаты* прасьвет.

А яшчэ *золата* — гэта крыж на тарчы ваяра з нашае Пагоні. Гэта сымбаль недасягальнае чысьціні Крыжа Сьвятое Эўфрасіньні Полацкай. Рэчы не для штодзённага ўжытку. *Золата.*

# Зона

***Сяргей Дубавец***

Слова „*зона*" належыць да групы звышадкрытых, „крэпкіх" словаў, якія сярод іншых вылучаюцца сваёй аголенасьцю і таму звычайна разбураюць эстэтыку беларускага верша і прозы. Падобна як ненарматыўная лексыка. Гэта зьвязана з агульным спэцыфічным стаўленьнем да эротыкі, як да нечага непрыстойнага, распуснага і заганнага. Узбуджэньне эрагенных *зонаў* у краіне, дзе „сэксу няма", магло сьведчыць толькі пра адно — пра вашу глыбока схаваную шпіёнскую сутнасьць. Румянец сораму афарбоўваў шчокі...

Звышэмацыйная *зона* прыйшла ў беларускую мову з расейскай, выцесьніўшы свае словы — кола, прасьцяг, абшар, пас або пояс, якія не вытыркаюцца з агульнага эмацыйнага поля мовы.

*Зона*, якая асацыюецца з турмой, Чарнобыльскай катастрофай і ваеннымі канфліктамі, за савецкім часам, як і многае тады, набывала адваротную эмацыйную афарбоўку. У пасьпяховага кіраўніка ўсе справы знаходзіліся „*ў зоне* асаблівай увагі", сацыялістычнае спаборніцтва мела *занальную* структуру, гарадзкія паркі на турыстычных схемах называліся „*зонамі* адпачынку", а возера Нарач — „курортнай *зонай*". Зэкі адкідаліся з *зоны*, на якой адбывалі тэрмін, і траплялі ў *зону* асаблівай увагі. Адрозьнівалі зоны паводле прыназоўнікаў: *у зоне* і *на зоне*.

Няма сумневу, што з пашырэньнем беларускае мовы, дакладней кажучы — эмацыйна неафарбаванай лексыкі, якога беларуская мова разам з мовамі разьвітых эўрапейскіх краінаў выразна адрозьніваецца ад расейскай, і што, у сваю чаргу, сьведчыць пра дэмакратычны ўнутраны патэнцыял народу, слова „*зона*" застанецца ў нашым лексыконе адно гістарычным знакам катастрофы і акупацыі.